Белорусская военная газета. Во славу Родины

16.02.2019

# «Айчыне служым»

Кацярына Іванова

Пад такой назвай у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі нядаўна адкрылася мастацкая выстава, прымеркаваная да 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і прысвечаная 100-годдзю Узброеных Сіл Беларусі, якое адзначалася ў мінулым годзе.

Арганізатары выставы — Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь, Студыя ваенных мастакоў пры Цэнтральным Доме афіцэраў.



У экспазіцыю пераважна ўвайшлі працы батальнага і партрэтнага жанраў — як ужо добра вядомыя грамадскасці, так і новыя, створаныя ў апошнія гады. Мастакоў цікавіць не толькі гераічнае мінулае краіны, але і сучаснасць, дынаміка развіцця Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Замалёўкі ваенных дзеянняў, вучэнняў, партрэты вайскоўцаў, у тым ліку Героя Беларусі лётчыка Уладзіміра Карвата, кавалера ордэна «За асабістую мужнасць» Дзмітрыя Гвішыані, і не толькі.

Дэманструюцца працы народнага мастака Беларусі Георгія Паплаўскага, заслужаных дзеячаў мастацтваў Рэспублікі Беларусь Мікалая Апіока, Уладзіміра Гардзеенкі, Леаніда

Дударэнкі, Уладзіміра Уродніча, а таксама Аляксандра Асядоўскага, Антона Вырвы, Георгія Лойкі.

Прыцягвае ўвагу праца «Крэпасць над Бугам» Леаніда Дударэнкі. Лёгка пазнавальныя руіны легендарнай Брэсцкай крэпасці, якая стала помнікам — сімвалам мужнасці першых абаронцаў нашай краіны. У праёме — постаць ветэрана, у правай руцэ — букет кветак, у левай — кій. На пінжаку — шмат медалёў. Твар задуменны, магчыма, ветэран узгадаў падзеі даўно мінулых дзён, паплечнікаў, тых, хто застаўся вечна маладым… Тэму памяці працягвае карціна Уладзіміра Гардзеенкі «Памяці санітаркі Наташы». Санітарная палявая сумка — магчыма, адзіная згадка пра тое, што на белым свеце жыў-быў чалавек… І россып пялёсткаў, бутоны, што апусцілі галовы ўніз…

Цікавая праца Георгія Лойкі «Пакаленне 2000-х». На палатне метафарычна спалучыліся гісторыя і сучаснасць. Падлеткі размясціліся на рэштках аб’екта ваеннага прызначэння, у іх руках — мабільныя тэлефоны, відавочна, вядзецца спакойная гутарка. Над іх галовамі — яснае неба. І гэта заслуга тых, хто ў грозныя 1940-я са зброяй у руках ваяваў за свабоду зямлі ад захопнікаў. Верагодна, на гэтым аб’екце ў часы вайны абарвалася не адно жыццё дзеля таго, каб зараз дзеці і ўнукі раслі пад мірным небам… Ва ўнісон ёй і праца Аляксандра Асядоўскага «Вышыня»: такое ж блакітнае неба, у вышыні лунаюць буслы, вачам адкрываецца прыгожы далягляд. Пагорак укрыты цудоўным кілімам з чырвоных кветак. Але ён не можа схаваць рэшткі ваеннага аб’екта. Ім ужо шмат год, яны зарастаюць травой, але застаюцца знакам-памяткай пра трагічныя падзеі…

Безумоўна, 75-годдзе вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў — важная дата для кожнага беларуса. Кожны трэці жыхар краіны загінуў на той вайне. І таму нам, нашчадкам, засталася вельмі адказная місія — берагчы памяць пра тых, хто коштам уласнага жыцця здабыў для нас перамогу, і трывала стаяць на варце міру.

Фота аўтара